Просто хорошая газета

Отдушина

12+

ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

№44 (791) 30 октября 2019 года

Издатель УП «Газета Слонимская» Основана 18 октября 2002 года Выходит один раз в неделю



«Мы утратили способность общаться, глядя друг другу в глаза»

В четверг, 24 октября, в Слониме состоялось районное родительское собрание, темой которого стал актуальный вопрос интернет-зависимости детей и подростков. Перед присутствующими выступила Наталья Волкова, ассистент кафедры нервных и нейрохирургических болезней Белорусского государственного медицинского университета.



Наталья Волкова

Наталья Анатольевна обстоятельно и интересно рассказала об опасности, которой подвержены наши дети, да и мы сами, проводящие время в интернете.

«Дети и подростки уходят в виртуальную реальность из-за недостатка внимания.

Интернет в отличие от родителей всегда готов ответить на любой вопрос, не отмахиваясь от ребенка, как это порой делаем мы. Дети уходят туда, где их всегда ждут, всегда им рады. К сожалению, 92% ничего не знают об опасности интернета», — рассказала Наталья Анатольевна.

По словам специалиста, из-за постоянного времяпрепровождения в интернете, общения с монитором, у детей пропадает ощущение эмоций.

«Со временем ребенку становится сложно считать эмоциональный окрас вашего посыла. Он привык общаться в интернете, где не приветствуется эмоциональность, — рассказала Наталья Анатольевна. — Например, вы приходите с работы расстроенная, бабушка попала в больницу, на вашем лице — печаль.

Но этого не видит ваш ребенок. Вы сообщаете о печальном известии, но на лице ребенка нет эмоций».

С точки зрения детей, время, проведенное в интернете, не пустая трата времени, в этом есть плюсы.

«Так, подростки считают, что если нет ограничений, значит, все можно.

Отсутствие ответственности, анонимность, возможность исправить ошибку путем проб или возвращений на другой уровень — это все, по мнению детей, плюсы интернета.

Взрослые должны своим примером показать, что время, проведенное в интернете не по делу, это не очень хорошо.

Мы утратили способность общаться напрямую, глядя друг другу в глаза, а не через монитор компьютера», — констатировала Наталья Анатольевна.

На сегодняшний день очень важно не упустить тот момент, когда простой интерес детей к компьютерной игре или необходимое пользование интернетом для учебы сменяется нездоровым влечением к пребыванию в социальных сетях.

Родителям следует наблюдать за своим ребенком и определять, нет ли у него интернет-зависимости, ее признаков. Конечно, тотальный контроль или запрет — это не решение проблемы.

Нас должно насторожить, если у подростка проявляются следующие симптомы: утрачивается чувство времени, то есть он не контролирует процесс пребывания в сети, теряется интерес к занятиям спортом, чтению, музыкой (спортом, чтением, туризмом, музыкой), самоустраняется от реальной жизни, общения со сверстниками, родственниками, становится раздражителен, когда компьютер по каким-либо причинам становится недоступен и принимает этот факт как вселенскую трагедию и т.д.

> «Только личный пример, совместное провождение свободного времени, семейные ужины в особенности помогут детям избежать интернет-зависимости.

Конечно, нельзя полностью исключать интернет из жизни школьника, так как полезную информацию иногда можно получить именно там.

Но и не стоит недооценивать опасность, исходящую от всемирной паутины.

Не оставляйте своего ребенка один на один с виртуальным миром.

Если возникла проблема с интернет-зависимостью, приложите все усилия, чтобы помочь подростку вернуться к реальной жизни.

Не стесняйтесь обращаться за помощью к специалистам», — резюмировала Наталья Волкова.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ФОТО АВТОРА

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8(01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваныя ў газеце.


Мадэлі Слонімскага быткамбіната. Фота з архіву Святланы Рымашэўскай

На фотаздымак, надрукаваны ў мінулым нумары, найперш адгукнуліся нашы чытачы Мікалай Яшкоў і Ніна Рыжова, якія пазналі Міхаіла Харчанку. Герой гэтага фотаздымка — калекцыянер і стваральнік музея вайсковага мундзіра Міхаіл Харчанка — завітаў да нас у рэдакцыю нават з нумарам «Газеты Слонімскай», у якім быў надрукаваны гэты здымак. А быў ён змешчаны ў №29 (58) у ліпені 1998 года. Такім чынам, рэтраздымку амаль 20 гадоў. Ён быў зроблены падчас паездкі Міхаіла Іванавіча на Корсіку на святкаванне дзён Напалеона.

— Злева на здымку — кіраўнік ваенна-гістарычнага клуба горада Аяча на Корсіцы, справа — начальнік Рэспубліканскага вучэбна-трэніровачнага цэнтра ваенізаванай пажарнай службы МУС РБ палкоўнік Генадзь Новік, — распавёў Міхаіл Харчанка. Ён яшчэ дадаў, што ў яго захоўваецца нават першы нумар «Газеты Слонімскай», які пабачыў свет у красавіку 1997 года.

Білетамі на дзве персоны ў Слонімскі драмтэатр на спектакль «Свабодны шлюб», які паказалі 27 кастрычніка, мы заахвоцілі нашых чытачоў Сяргея Копаця, Ніну Рыжову і Мікалая Яшкова.

Жанна ІВАНОВА

ФОТОКОНКУРС «ЗОЛОТАЯ ОСЕНЬ»

Осень — яркое время года, когда листья деревьев и плоды окрашиваются в желтые, оранжевые и красные цвета. Все это многообразие красок можно запечатлеть на фото и прислать нам на фотоконкурс «Золотая осень».

Фотоконкурс будет проходить с 5 октября до 5 ноября. Присылайте ваши фото на тему «Золотая осень» на эл. ящик anna@gs.by.

В письме обязательно укажите ваши фамилию, имя и телефон.

6 ноября жюри выберет лучшие работы.

Победитель получит приз — оригинальный набор для специй.

Все ваши фото будут размещены на сайте gs.by.


Фото Виктора Бусловича


Фото Юлии Сидорик


Фото Валерии Кононовой



Фото Екатерины Селеня


Фото Елены Гаркевич

ФОТОКОНКУРС «НАША СВАДЬБА»

1 ноября на сайте gs.by состоится онлайн-голосование, которое определит победителя фотоконкурса «Наша свадьба».

Главный приз — оригинальная стойка из ростовых роз — достанется тому участнику, чья фотография наберет наибольшее количество голосов. Голосуйте на сайте gs.by за лучшее фото!



Павел и Анастасия Жилинские


Илона и Евгений Гуща

Як зарабіць 500 долараў без дапамогі дзяржавы

РАСПАВЯЛІ БІЗНЕСОЎЦЫ І ЭКСПЕРТ

У чэрвені сярэдні заробак па краіне склаў 1080,5 рубля*. Па факце палова беларускага насельніцтва атрымлівае менш за 800 рублёў, а другая палова — больш за 800. А калі казаць дакладней, то большая частка беларусаў — 64% — атрымліваюць заробак ад 300 да 1000 рублёў. І толькі 21,6% маюць ад 1000 да 1500 рублёў штомесяц.

сярэдні заробак па краіне
1080,5 рубля

64%
АТРЫМЛІВАЮЦЬ **АД 300 ДА 1000 РУБЛЁЎ**

21,6%
АТРЫМЛІВАЮЦЬ **АД 1000 ДА 1500 РУБЛЁЎ**
*па дадзеных Белстата

Усё часцей кіраўніцтва розных узроўняў агучвае думку: мы забяспечваем мінімум, а далей вы самі варушыцеся. «Добра будзе, калі атрымаецца зарабляць 1000 долараў пры той сацыяльнай абароне, якая ёсць у краіне, — памарыў сёлета Аляксандр Лукашэнка. І дадаў: — Але гэта ўжо задача самога чалавека, а не столькі дзяржавы».

Тым часам у Беларусі працуюць ужо больш за 250 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў** — беларусаў, якіх не задаволіў іх заробак, і яны распачалі ўласную справу. Невялікія фірмы і прадпрымальнікі ў 2018 годзе вырабілі 24,6% унутранага валавага прадукту ў Беларусі*, і пры гэтым на іх прыйшлося 43,8% выручкі ад рэалізацыі тавараў і паслугаў усёй краіны*. І распачаць уласны бізнес ніколі не позна.

*па дадзеных Белстата
**па дадзеных Міністэрства па падатках і зборах, 1 ліпеня 2019

Крыніцы стартавага капіталу

1. Грошы ад сяброў і сваякоў

Узяць пазыку ў сваякоў або сяброў – даволі распаўсюджаны варыянт. У гэтым выпадку вы не дзеліцеся долямі вашага бізнесу і можаце дамовіцца на досыць мяккія ўмовы пазыкі.

2. Партнёры з бізнесу

Шукайце сузаснавальнікаў ці бізнес-анёлаў, якім цікавы ваш кірунак: за долю ў кампаніі яны дадуць вам грошы. «Анёльскімі» інвестыцыямі ў Беларусі цяпер займаецца аб'яднанне бізнес-анёлаў Angels Band і арганізацыя QS Андрэя Гусарава.

3. Крэдыт у банку

МТБанк дае крэдыты стартапам, якія працуюць менш за год, пад 11,17 % гадавых у беларускіх рублях, а ў «Белгазпрамбанку» можна атрымаць грошы пад 14,5 %.

4. Субсідыі і гранты

Калі вы зарэгістраваныя на біржы працы як беспрацоўны, то маеце права на атрыманне субсідыі для адкрыцця ўласнага бізнесу. Яшчэ варыянт – грант, які можна атрымаць, перамогшы ў конкурсе Social Weekend або конкурсе жаночых стартап-праектаў Lady Awards.

ЯК «КІДАЮЦЬ» СЯБРЫ З БІЗНЕСУ

Іван Пільнікаў, заснавальнік студыі Webber. by




Пачынаць бізнес можна самастойна, а можна паклікаць сяброў і аб'яднаць пачатковыя капіталы ды навыкі. Гэта зручна, але небяспечна. Праз бізнес-канфлікты можна страціць сябра. З Іванам Пільнікавым так і адбылося: гандляваць металам яны пачыналі ўтрох. Ведалі хлопцы адзін аднаго з пятнаццаці гадоў. Калі вырашылі працаваць разам, дамовіліся, што адзін сябар укладаецца ў агульную справу грашыма, а іншыя — сваёй кампетэнцыяй. Ніякіх доляў нідзе не прапісвалі і нават не думалі тады пра гэта. Сябры ж.

Іван займаўся продажам, знаходзіў кліентаў. І вось, у той жа дзень, калі хлопца кінула дзеўчына, сябар, які лічыўся кіраўніком кампаніі, папрасіў яго звольніцца. Іван быў у такім шокавым стане, што нават не стаў высвятляць, што да чаго. Проста сышоў. Хлопец тлумачыць звальненне тым, што ён часта спрачаўся з сябрам пра шляхі развіцця кампаніі, іх погляды не супадалі.

З трэцім сябрам Іван працуе і цяпер. У іх кампанія вэб-распрацовак. Але, навучаныя досведам, гэтым разам хлопцы дакладна абазначылі ды прапісалі ў дакументах абавязкі кожнага і долі прыбытку.

ПРОСТА ПАЙШОЎ І ПАЧАЎ РАБІЦЬ

Фёдар Шылін, заснавальнік брэнду Vokladki



Уласны бізнес Фёдар Шылін пачаў яшчэ студэнтам трэцяга курса, калі вучыўся на лагіста. Ягоныя мары былі вельмі рэалістычнымі: хацеў мець магчымасць запрасіць дзяўчыну ў прыстойнае месца на спатканне і жыць асобна ад бацькоў.


Доўга не разважаючы, куды прыкласці намаганні і чым палепшыць свет, ён проста пачаў рабіць: шыць дома вокладкі на пашпарты. Яны былі каляровымі, вясёлымі і адразу спадабаліся моладзі. Сам таго не ведаючы, ён ухапіў трэнд. Вокладкі добра разыходзіліся праз інтэрнэт-краму. Удзень Фёдар шыў, вечарамі развозіў замовы кліентам. Так стварыўся брэнд Vokladki.

Паступова Фёдар пачаў атрымліваць гуртовыя замовы і працаваць з крамамі. У 22 гады хлопец ужо зарабіў на ўласнае аўто і з'ехаў ад бацькоў. Натуральна, што, скончыўшы ВНУ, ён працягнуў працаваць на сябе. З цягам часу попыт змяніўся: цяпер цікавымі вокладкамі нікога не здзівіш, таму хлопец пачаў працаваць са скурай, набыў неабходнае абсталяванне. Паступова пашырыў асартымент манетніцамі, ключніцамі, крэдытніцамі, пачаў шыць заплечнікі і модныя торбы на пас. Цяпер ягоны бізнес — гэта каманда, на яго ўжо працуюць тры швачкі, адмысловец з продажу і бухгалтар.



ХАЧУ ТЫСЯЧУ — І КРОПКА

Алёна Някрасава, заснавальніца курсаў Ciao. by



Пасля сканчэння ўніверсітэта Алена Някрасава паставіла сабе мэту — атрымліваць тысячу. І нават не ў беларускіх рублях, а ў доларавым эквіваленце.

Няпростае заданне для беларуса. «Гэтую суму я ўзяла не са столі. Я дзяўчына з Барысава, мне трэба было здымаць тут аднапакаёвую кватэру, мне трэба было харчавацца», — узгадвае, з чаго пачынаўся яе бізнес, заснавальніца курсаў Ciao. by Алена Някрасава.

Дзеўчына пачала шукаць працу з такім заробкам. Рабіла ўхіл на добрае веданне замежных моваў. Але праз паўгода пошукаў найлепшае, што знайшлося, — стабільныя 800 долараў. Была яшчэ прапанова на 1000 долараў, але паводле дамовы падараў. Гэта значыць, што праца і заробак нестабільныя і яна зноў не атрымае штомесяц сваёй запаветнай тысячы. У прынцыпе, гэта былі някепскія прапановы для выпускніцы, аднак Алена на гэта не пагадзілася. Хаця і была ў адчаі. Стала зразумела, што шлях да тысячы — адзін: рабіць штосьці сваё. І дзяўчына стала рэпетытаркай англійскай мовы, якую вывучала ў ВНУ. Расклеіла аб'явы па раёне, пачала вучыць кліентаў дома. Гэта дазволіла ёй назапасіць крыху грошай, зняць офіс і працаваць з вучнямі ўжо ў больш зручных умовах. Паступова яе ініцыятыва пашырылася да курсаў англійскай і італьянскай моваў. Цяпер у яе камандзе шасцёра настаўнікаў, якія навучаюць прыблізна 60 кліентаў.

Апошнім часам Алена засяродзілася на выкладанні англійскай мовы, бо попыт на яе не зніжаецца. А вось на італьянскую паменшаў: з-за крызісу ў Італіі беларусы перасталі ездзіць туды на працу і, адпаведна, вывучаць мову. У школе Алена цяпер амаль не выкладае, як кіраўніца яна выконвае больш менеджарскія функцыі. Сваю тысячу штомесяц Алена ў выніку атрымала.

і што трэба, каб адкрыць уласны бізнес



Міхал Залескі, эканаміст, эксперт тэлепраграмы «Асабісты капітал»

Навошта бізнесоўцам-пачаткоўцам пісаць бізнес-план?

Прарок Мухамэд казаў у такіх выпадках: «Калі вы такія разумныя, то чаму смяротныя? Маглі б і вечна жыць». Параўнальнай статыстыкі эфектыўнасці мікрапраектаў з планам і без яго ніхто не рабіў, але нават міні-праекты, ад 1000 рублёў, без планаў нікім не крэдытуюцца. Калі выбіраеш, ці праца ці бізнес, спачатку сядзь ды распішы не толькі магчымыя даходы і выдаткі, але і колькі часу будзе займаць работа на сябе. Так зразумееш, колькі каштуе твая праца і што табе выгадней.

Топ-5 сфераў дзейнасці для ІП

1 Гандаль, рамонт аўтамабіляў і матацыклаў

2 Транспарт, складаванне, паштовая і кур'ерская дзейнасць

3 Прафесійная навуковая і тэхнічная дзейнасць

4 Будаўніцтва

5 Прамысловасць

*па дадзеных Белстата

ІП ці фірма?





ПРАДПРЫМАЛЬНІК

ПЛЮСЫ

- ТАННАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
- НЕ ПАТРЭБНА ПАМЯШКАННЕ ДЛЯ ЮРЫДЫЧНАГА АДРАСА
- НЕ ПАТРЭБНЫ ЎСТАЎНЫ ФОНД
- МОЖА САМАСТОЙНА ВЕСЦІ БУХГАЛТАРСКІ ЎЛІК
- МОЖНА ВОЛЬНА АБЫХОДЗІЦЦА З СРОДКАМІ, АТРЫМАНЫМІ АД ДЗЕЙНАСЦІ

МІНУСЫ

- НЕ БОЛЬШ ЗА ТРЫ ЧАЛАВЕКІ НАЁМНЫХ РАБОТНІКАЎ
- АДКАЗВАЕ ЗА ДЗЕЙНАСЦЬ УСЁЙ СВАЁЙ МАЁМАСЦЮ

ФІРМА

ПЛЮСЫ

- ТАННАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
- НЕ АДКАЗВАЕ ПА АБАВЯЗАННЯХ ЮРЫДЫЧНАЙ АСОБЫ СВАЁЙ МАЁМАСЦЮ (АКРАМЯ ТДА)

МІНУСЫ

- ПАТРЭБНЫ ЎСТАЎНЫ ФОНД
- ПАТРЭБНЫ ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР
- АБМЕЖАВАННІ Ў КОЛЬКАСЦІ РАБОТНІКАЎ ПРЫ ПРАЦЫ ПАВОДЛЕ СПРОШЧАНАЙ СІСТЭМЫ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

Топ-5 найбольш прыбытковых сфераў*

56,9 Аперацыі з нерухомаю маёмасцю

28,5 Забеспячэнне электраэнергіяй, газам, парай, гарачай вадой і кандыцыянаваным паветрам

27,3 Інфармацыя і сувязь

19,5 Прафесійная, навуковая і тэхнічная дзейнасць


13,1 Дзейнасць у сферы адміністрацыйных і дапаможных паслуг

*% рэнтабельнасці для сярэдніх, малых і мікраарганізацый у 2018 г.

*па дадзеных Белстата

ПАСЛУГІ БЕЗ РЭГІСТРАЦЫІ

Існуе 30 прафесіяў, прадстаўнікі якіх могуць працаваць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Такія людзі называюцца самазанятымі. Каб стаць самазанятым, трэба падаць у падатковую службу апавяшчэнне і сплаціць адзіны падатак, памер якога залежыць ад паселішча. І можна працаваць на сябе.



Продаж кветак



Дызайн інтэр'ераў, графічны дызайн



Паслугі цырульнікаў і касметолагаў




Тынкавальныя і малярныя працы



Рэпетытарства



Паслугі фотаздымання



Распрацоўванне вэб-сайтаў, рамонт ПК




Паслугі сядзелак і нянек




Рамонт і вытворчасць адзення/абутку

Дзе пачынаць бізнес?



Сярэднія і малыя мясцовасці

Вызваленыя ад падатку на прыбытак ад уласнай вытворчасці, падатку на нерухомасць, платы за ліцэнзіі (Дэкрэт № 6).



Паўднёва-ўсходні рэгіён Магілёўскай вобласці

Ільготы па ўнёсках у ФСАН, падаходным падатку, у фінансаванні выдаткаў на стварэнне інжынернай і транспартавай інфраструктуры ды г. д.



Аршанскі раён

Меншыя ўнёскі ў ФСАН і падаходны падатак, зменшана стаўка падатку, вызваленне ад ПДВ пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, мараторый на правядзенне праверанняў.

ТАА «Выдавецкі дом «Інтэкс-прэс»
УНП 200687896



В клубе «Надежда» всегда весело

«Надежда» — их компас земной

В четверг, 24 октября, прошло очередное заседание клуба «Надежда» — объединения слонимчан в возрасте от 55 до 80 лет и старше.

У всех присутствующих была возможность пообщаться с Олегом Таргонским — председателем Слонимского районного Совета депутатов, который посетил встречу. Члены клуба не упустили шанс задать вопросы представителю власти, диалог с Олегом Мечиславовичем прошел в дружеской атмосфере и длился более часа.

Олег Мечиславович, несмотря на занятость, после официальной части остался посмотреть и на творческую составляющую.

Ведущие мероприятия — Михаил Лойко и Екатерина Чигрин — начали заседание с песни.

Только положительные эмоции, задор и бодрость продлевают жизнь. В клубе «Надежда» слонимчане отдыхают душой, набираются сил и накапливают жизненные силы.

Ольга ШИНКЕВИЧ



Поют — заслушаешься



ХОЗЯЙКЕ НА ЗАМЕТКУ

ТЫКВА С МЁДОМ И ОРЕХАМИ



Тыква – прекрасная основа для приготовления десерта, особенно если хочется порадовать домашних сластён.

Что взять:
Тыква (очищенная) — 0,5 кг
Орехи грецкие — 0,1 кг
Мёд, сахар, масло сливочное — по 1 ст. ложке

Как приготовить:
Тыкву почистить и порезать на ломтики толщиной в 1 см. Разместить кусочки на противне и полить небольшим количеством воды (2 ст. л.). Покрыть лист фольгой и отправить запекаться в духовку. Оставить там на полчаса при температуре в 190 градусов.

Наступило время приготовить сладкую смесь. Для этого необходимо измельчить орехи, растопить масло. Добавить мёд и сахар. По истечении указанного времени достать тыкву из духовки, убрать фольгу и полить сладкой орехово-медовой массой. Десерт снова поставить в духовку ещё на десять минуть. Полезная сладость готова к подаче на стол.

МОРС КЛЮКВЕННЫЙ

Польза клюквенного морса очевидна для всех! Такой напиток и тонизирует, и бодрит, и повышает физическую работоспособность, а также активизирует работу нашего мозга.



КЛЮКВЕННЫЙ МОРС: РЕЦЕПТ

На сегодняшний день рецептов приготовления клюквенного морса очень много. Давайте рассмотрим один: клюквенный морс с мёдом — отличная профилактика простуды зимой.

Ингредиенты:
1,5 стакана свежих ягод клюквы;
1 литр чистой родниковой воды;
2-2,5 столовых ложки мёда.

Прежде всего, клюкву нужно перебрать и выбросить плохие ягоды, если они есть. Деревянной ступкой разомните ягоды в глубокой миске, лучше всего при этом использовать неметаллическую посуду. Теперь процедите получившуюся смесь или через сито, или через марлю. У вас должна появиться кашица с семечками и клюквенный сок; сок пока отставьте в сторонку.

Кашицу с семечками и кожурой залейте одним литром воды и поставьте на огонь. Как только морс начнёт закипать, убавьте огонь и дайте ему покипеть в течение 5-7 минут. По истечении этого времени огонь выключаем, а сам морс опять процеживаем; теперь полученную кашицу можно просто выбросить.

Далее вливаем в кастрюлю отставленный нами ранее клюквенный сок и даём морсу закипеть ещё раз. В получившийся морс, пока он ещё горячий, добавляем наш мёд и даём ему там «разойтись»; можно помочь ему и перемешать ложкой.

СПОРТ

«Слоним 2017» в Бресте прервал серию своих поражений


ФОТО: ОФИЦИАЛЬНЫЙ САЙТ ФК «РУХ» БРЕСТ

Опасный момент у ворот

В субботу, 26 октября, сыграв вничью 1:1 с брестским «Рухом», слонимская команда прервала серию своих поражений.

«Рух» (Брест) — «Слоним 2017» — 1:1 (1:1)

ФК «Слоним 2017»: Сай (к), Зубрицкий, Хмельницкий, Заборонько, Харланов, Спасюк, Баль, Трачинский, Новик (Чернодаров, 81), Владислав Берг (Вильгельм Берг, 56), Журневич.

Голы: Журневич (6), Хмельницкий (41, автогол).

Предупреждения: Букаткин (16), Шубович (83), Тымонюк (84), Сибилев (90); Заборонько (5), Хмельницкий (19), Харланов (34).

Так получилось, что в Бресте отличились голами только слонимские футболисты. Сначала на 6-й минуте, после передачи Баля, удар Василия Журневича достиг цели. А затем, на 41-й минуте, при розыгрыше углового, отскочив от ноги Хмельницкого, мяч оказался в сетке наших ворот.

Во втором тайме опасные моменты создавались двумя командами. У хозяев их было больше. Но на последнем рубеже был надёжен вратарь слонимчан Дмитрий Сай, хорошо отыграла защита.

На 71-й минуте мог забить подключившийся к атаке защитник гостей Евгений Заборонько. К сожалению, его удар головой оказался неточным.

По результатам 26-го тура «Слоним 2017» с 20 очками по-прежнему находится на 12-м месте в таблице.

ФК «Сморгонь» и пинская «Волна» с 17 очками делят между собой 13-ю и 14-ю позиции.

2 ноября в Слониме на стадионе «Юность» состоится важнейшая встреча со «Сморгонью».

Сергей БУЗУН

P.S. Евгений Заборонько, Дмитрий Хмельницкий и Владимир Харланов из-за накопленных жёлтых карточек не смогут принять участие в ближайшем матче со сморгонским клубом.

Зося

У вёсцы Калібкі іхняя хата была адметнай: доўгая, на два канцы. У адной палове жылі гаспадары, у другой — кватаранткі-настаўніцы з сямігодкі, што за Кіламетр ад Калібкаў. Прынамсі, былі толькі гаспадыні, бо гаспадар Іван Сухалёт загінуў на вайне, якая адгрымела дзевяць гадоў назад. Яго жонка Стася, дочкі Ванда і Гэля былі вельмі працавітыя. Усе дзялкі збожжа зжыналі першымі і буракі апольвалі раней за ўсіх. Малодшая Зося, якой не было і сямнаццаці, спраўлялася не горш за сясцёр, а прыгажосцю вызначалася на ўсю ваколіцу.

У той час вясковым дзеўкам выйсці замуж было цяжка, бо многія хлопцы не вярнуліся з вайны, але Вандзе і Гэлі, можна сказаць, пашанцавала. Ванду ўзяў замуж бяздзетны ўдавец з Маладзечна, а Гэля пайшла за аднарукага хлопца з далёкай вёскі Гірбеняты.

Зося з мацерай засталіся адны.

— Не ведаю, як мы справімся з гаспадаркай, — бедавала Стася. — Я сенаваць ужо не магу, бо вельмі рукі баляць, а ты ж касіць не ўмееш... Бо і праўда, які з цябе касец: малая, худая, пра такіх кажуць, кот за ноч з`есць.

— Во клопат знайшла! — Зося падняла на мацеру свае сінія, як вясновае неба, вочы. — Не ўмею, то навучуся. Бачыла ж, як ты касіла.

Тая вучоба пачалася з аселіцы, калі падрос мурог. Спачатку каса залазіла носам у зямлю, і яе адтуль цяжка было выцягнуць.

— Трымай лягчэй, не цісні так моцна, — павучала Стася. — І не гніся, плечы трымай роўна.

З часам пракосы станавіліся раўнейшымі, каса — паслухмянейшай. Толькі на далонях надуваліся мазалі. Зося перавязвала іх кужэльным лапікам, але работу не кідала.

— Сірацінка бедная, горкая доля цябе чакае... — плакала тайком Стася.

Нібы ведала, нібы магла прадугледзець... Напрадвесні яна раптоўна памерла, пакінуўшы Зосю адну ў старой вялікай хаце. Настаўніцы да гэтага часу ўжо знайшлі кватэру бліжэй да школы.

Яна так загружала сябе работай, што, прыйшоўшы дадому, валілася з ног. Менавіта работа адганяла сумныя думкі, не так душыла адзінота. Яна працавала ў калгасе і трымала сваю гаспадарку: карову, свіней, курэй. Раніцай, калі неба на ўзыходзе толькі ружавела, брала касу, посцілку і ішла ў лес абкошваць дарогі, а потым несла ўсё на надворак і сушыла. Трава з дзялак таксама на плячах зносілася дадому, бо і яна зімой спатрэбіцца на сечку карове.

Зося пастарэла раней часу. На худых плячах палінялая сукенка вісела нібы на калу, ад цяжкай работы постаць сагнулася, на мілавідным твары з'явіліся маршчыны. Толькі вочы не страцілі сінявы вясновага неба. Яна не спадзявалася на замужжа, хаця ў глыбіні душы марыла пра дзіцятка. Часта сніла, як шыю абдымаюць пяшчотныя ручкі, а да шчакі прытуляецца дзіцячая шчочка.

— Нешта непамыснае лезе ў галаву, — прачнуўшыся, дакарала сябе. І бралася за работу, якой у вёсцы заўсёды процьма.

Аднойчы ў іхні калгас прыслалі маладога заатэхніка, і старшыня прывёў яго да Зосі на кватэру:

— Іванаўна, будзь ласкава, дай чалавеку прытулак. Хацелася б, каб і ежу яму рыхтавала.

— Ой, можа, ён прывык да прысмакаў, то ў мяне гэтага няма. Усё па-вясковаму...

— То і добра, калі па-вясковаму, — усміхнуўся хлопец, і ў ачарсцвелай Зосінай душы ад гэтай усмешкі прабіўся праменьчык радасці.

З таго часу, як Васіль Савойка застаўся ў яе жыць, Зосю як падмянілі. Яна нібы памаладзела, пачала хораша апранацца.

— На што я спадзяюся? — дакарала сябе. — Ён жа маладзейшы... І дзевак вунь колькі ў вёсцы, маладых, прыгожых...

Праз два гады Зося зразумела, што цяжарная. А калі гэта заўважыў і кватарант, звольніўся з работы, і яго нібы ветрам здзьмула. Ды кабету гэта не засмуціла. Як найвялікшага шчасця чакала яна нараджэння дзіцяткі, надта хацела, каб быў сынок.

— Памочнік мне будзе, — радавалася. — Пылінкі з яго стану здзьмухваць, выгадую-выпестую як ніхто на свеце...

Зосін Казік не ацаніў маміных клопатаў. Яна прападала ў рабоце, а ён нават вядра вады ў хату не прынёс, палена дроў не расек. Затое ніколі не прамінаў, дзе што кепска ляжыць. Колькі клопатаў і сораму мела яна і ад вяскоўцаў, і ад міліцыі.

Ледзь закончыў сем класаў, знік з вёскі. Спачатку Зося і плакала, і шукала яго — дарэмна. А потым нават рада была, што так усё атрымалася. Спакайней жыць стала.

Праз пару гадоў калгас пабудаваў ёй новую хату, бо старая ўжо ўрасла падмуркам у зямлю, прагнулася страха. Зося была ўдзячна, што так цэняць яе працу.

Аднойчы вясной, калі з палёў ужо сышоў снег і людзі рыхтаваліся да сяўбы, ля Зосінага двара спынілася легкавая аўтамашына. Шафёр застаўся за рулём, а пасажыр вышаў і накіраваўся на падворак. Ён агледзеў дабротны будынак, а потым зайшоў у хату. Зося якраз збіралася абедаць, налівала ў міску капусту ды так і стала з чарпаком у руцэ. Яна і верыла, і не верыла сваім вачам.

— Што, мама, не пазнаеш? Гэта я, твой непаслухмяны Казік, ад якога мела столькі клопату і ганьбы. То цяпер можаш мной ганарыцца: прызначылі начальнікам гандлю ў наш раён. Шмат дарог я прайшоў, шмат выпрабаванняў зведаў, каб выбіцца ў людзі...

Зося кінулася да сына, хацела абняць за шыю, ды не дастала, такі ён быў высокі і салідны. Казік сам моцна прытуліў маці да грудзей.

— Зараз прынясу табе падарункі і пачастункі, іх у машыне шмат.

Паабедалі, пагутарылі, а потым Казік і кажа:

— Вясну і лета можаш жыць тут, а восенню забяру да сябе. У мяне гарадская кватэра з усімі зручнасцямі. І жонка ў мяне цудоўная, і дачушка... Мы цябе не пакрыўдзім...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Афиша

Слонимский драмтеатр

2 ноября, суббота
Спектакль для детей «День рождения кота Леопольда» (на белорусском языке), начало в 12.00.

Слонимский центр ремесел

31 октября, четверг
Открытое заседание любительского объединения «Спадчына» (для пожилых людей), начало в 11.00

Слонимский центр культуры

Кинозал

30 октября, среда
12.00 «Малефисента: Владычица тьмы» 3D (США, 6+, семейный, 1.58)
14.00 «Девушки бывают разные» 2D (Россия, 16+, комедия, 1.30)
21.00 «Zомбилэнд: Контрольный выстрел» 2D (США, 18+, ужасы, 1.40)

31 октября, четверг
12.00 "Урфин Джюс возвращается" 3D (Россия, 6+, мультфильм, 1.16)
13.30 «Семейка Аддамс» 3D (США, 12+, мультфильм, 1.26)
21.30 «Болевой порог» 2D (Россия, 16+, триллер, 1.40)

1 ноября, пятница
10.30 «Урфин Джюс возвращается» 3D (Россия, 6+, мультфильм, 1.16)
12.00, 13.30 «Семейка Аддамс» 3D (США, 12+, мультфильм, 1.26)
18.30, 20.30 «Болевой порог» 2D (Россия, 16+, триллер, 1.40)

2 ноября, суббота
12.00, 15.00 «Семейка Аддамс» 3D (США, 12+, мультфильм, 1.26)
13.30 «Урфин Джюс возвращается» 3D (Россия, 6+, мультфильм, 1.16)
16.30 «Zомбилэнд: Контрольный выстрел» 2D (США, 18+, ужасы, 1.40)
18.30, 20.30 «Болевой порог» 2D (Россия, 16+, триллер, 1.40)

3 ноября, воскресенье
12.00, 15.00 «Семейка Аддамс» 3D (США, 12+, мультфильм, 1.26)
13.30 «Урфин Джюс возвращается» 3D (Россия, 6+, мультфильм, 1.16)
16.30 «Zомбилэнд: Контрольный выстрел» 2D (США, 18+, ужасы, 1.40)
18.30, 20.30 «Болевой порог» 2D (Россия, 16+, триллер, 1.40)

За главного редактора Николай Николаевич Кононович
Учредитель Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК
ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ
Телефоны редакции: Velcom: 8-029-133-04-21 факс: 8 (01562) 2-90-00 звонить с 9.00 до 18.00 Skype — gazslon
Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41 Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41
Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.
Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.
Свободная цена
Тираж номера 3010 экз.
Время подписания к печати по графику 29 октября 2019 года 17:00
РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА 8(044) 715-90-03 8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03 ул. Красноармейская, 41 e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com
Объем — два условных печатных листа. Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025 ЛП №02330/39 от 27.03.2014 Заказ № 4885
Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь
ISSN 1991-3362



